Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 20 Вільня, Нядзеля 15 Чэрвеня 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Ці будзе Сабор Праваслаўнай Царквы ў Польшчы.

Дэкрэт Прэзыдэнта на імя мітрапаліта Дзянісія аб скліканьні ў недалёкай будучыні Сабору Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, відаць зрабіў вялікае ўражаньне сярод ня толькі праваслаўнага, але нават грамадзянства іншых вызнаньняў Польшчы. Польскія газэты, амаль што ня усе, гаворадь аб гэтым з асаблівай урачыстасьцю. Тое самае трэба сказаць і аб расейскай прэсе, ня толькі краёвай, а нават і заграгічнай. Дэкрэт гэты яна разважае, як гістарычнае „событіе“ ў жыцьці Праваслаўнае Царквы ў Польшчы, як „зварот да саборнасьці“ і гэтак далей. Значна больш устрыманасьці і скептыцызму выяўляе прэса ўкраінская.

Столькі часу чакае Праваслаўная Царква Сабору, столькі барацьбы было за гэты Сабор, столькі аб скліканьні Сабору ня толькі нагаворана было слоў і сьпісана паперы, але нават і пацярпела людзей — тры архірэі і некалькі міран высланы за граніцу, адзін пасаджаны ў манастыр, — што няма нічога дзіўнага, калі дэкрэт аб скліканьні Сабору зрабіў такое ўражаньне. Аж надта доўга чакалі!

Але-ж гэта самае чаканьне і нас ужо адвучыла верыць у шчырасьць усіх гэтых пажаданьняў і абяцанак. Калі праўда, што Сабор склікаецца „w trosce o dobro wszystkich obywateli prawosławnych w Polsce“, дык гдзе-ж гэта „троска“ была дагэтуль? Чаму-ж папярэднія ўрады ня склікалі гэтага Сабору? З якой мэтай рабіліся абходы канонаў Праваслаўнай Царквы, забарона публічных лекцыяў і адчытаў аб Царкве*) і г. д. Ці-ж урад Слаўка лепшы ад усіх быўшых урадаў адносна да праваслаўнай Царквы? Нешта мала ў гэта верыцца. Усё гэта дае нам права і на гэты раз з пэўным недаверам аднясьціся да ўрачыстых абяцанак ураду.

Яшчэ больш недаверу выклікае ў нас урачыстае абвяшчэньне вышэйшай улады царкоўнай: „Желаніе сердецъ нашихъ исполнилось!“ — піша мітрапаліт у сваім перадсаборным „архіпастырскім пасланіи“. Калі гэта запраўды ёсьць шчырым „желаніем сердец нашых“, чаму-ж у „Воскресном Чтеніи“, якое зьяўляецца аффіціозам (напалову афіціальным, ці ўрадавым органам мітраполіі), стацьці якога выдаюцца ня толькі пад цэнзурай, але нават і пад рэдакцыей мітраполіі,— чаму-ж там амаль ня ў кожным нумары вядзецца гарачая палеміка з усімі праявамі імкненьня да саборнасьці? Чаму-ж яшчэ на гэтых днях мітраполія забараніла праваслаўнаму духавенству друкаваць свае стацьці аб царкоўных пытаньнях у газэтах? Чаму яшчэ на гэтых днях за адну такую стацьцю з прызывам да запраўднай саборнасьці царкоўная ўлада жорстка пакарала (на шэсьць месяцаў без пасады) аднаго з вілнейшых праваслаўных сьвяшчэньнікаў у Варшаве (протопрэсвіцера Тэодоровіча)? Праўда, пад націскам агульнага абурэньня праваслаўнага грамадзянства гэтая кара з яго была знята, але гдзе было больш шчырае „желаніе сердец наших“, — ці тады, калі яго каралі, ці тады, калі здымалі з яго кару, ня трудна дагадацца, бо каралі **па сваей волі**, а звальнялі па волі праваслаўнага грамадзянства.

І гэтакія рэпрэсіі стасуюцца да духавенства якраз тады, калі іменна ў перадбачаньні Сабору асабліва важна пачуць зусім свабодна высказаныя погляды з усіх слаёў праваслаўнага насяленьня.

З усяго гэтага відаць, што ў вышэйшай царкоўнай улады няма шчырага жаданьня Сабору, як поўнаўладнай інстытуцыі, такой інстытуцыі, якая павінна зрабіць адкрытую і свабодную крытычную паверку ўсяго, што зроблена дасюль царкоўнай уладай і вынясьці свой астатні прыгавар.

Мімаволі прыходзе на думку, што і цяпер усе гэтыя падгатоўкі да Сабору будуць рабіцца так, каб толькі зацягнуць час гэтага саборнага суду.

Але як-бы там ня было, гэта ўрачыстае абвешчаньне Сабору мы разглядаем як **першую перамогу грамадзкай апініі**. Першы крок зроблены і справа ўжо больш-менш знаходзіцца ў руках перадсаборнай камісіі. Ад яе перадусім залежыць свабодна і шчыра паставіць у праграму Сабору ўсе тыя пытаньні, вырашэньне якіх зьяўляецца найважнейшай патрэбай і унутраньняга і вонкавага жыцьця царквы — паставіць і абараніць іх пастаноўку на Саборы. Калі гэта удасца, гэта будзе другой перамогай царкоўнай грамадзкасьці над царкоўнай бюракратычнасьцю. Гэтай камісіі ўперад заўсё мы і жадаем шчыра пладатворнай працы для дабра праваслаўнага насельніцтва Заходняй Беларусі і Украіны.

*) У Вільні два разы сэн. Багдановічу мясцовая ўлада не дазволіла публічнай лекцыі аб становішчы Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Адзін раз справа даходзіла да міністэрства і да Сойму і ўсёроўна лекцыі не дазволілі.

На выбары ў Сьвянцянскім вокрузе.

На 13 ліпня сёл. г. назначаны новыя выбары ў Сьвянцянскім выбарным вокрузе, абыймаючым паветы: Сьвянцянскі, Пастаўскі, Браслаўскі і Дзісьненскі. Людзі блізкія да ўрадавых кругоў, якім не падабаецца Сойм і соймавы кантроль над дзейнасьцю ўраду, часта адгаварваюць ад удзелу ў выбарах кажучы, што гэты Сойм недаўгавечны, што ён нічога не дае і г. д. Гэтак гаворачы, яны стараюцца ўгаварыць народ, каб ён устрымаўся ад выбараў.

Як-жа-ж мы павінны глядзець на гэту справу? Мы тут павінны сьцьвердзіць, што Сойм заўсёды для народу карысны. Сойм ці інакш кажучы парлямант існуе па ўсіх дзяржавах, ён існуе дзеля таго, **каб кантраляваць урад і каб выказваць народныя патрэбы.**

Што з таго, што мы будзем седзячы на вёсцы наракаць на труднае жыцьцё і на вялікія падаткі, нас усё адно ніхто не пачуе! Горш можа быць: нас паліцыя можа палічыць за бунтароў і пасадзіць у „кутузку“ нібы за „проціўдзяржаўную“ дзейнасьць. Вёска заўсёды астаецца вёскай, а голас яе чуе толькі войт (і то незаўсёды), солтыс і... сышчык. Яны заўсёды ўважна сьлядзяць за тым, што робіцца на вёсцы і даносяць сваймў начальству. Як гэтыя даносы памагаюць у нашай бядзе, мы добра ведаем.

А сусім другая справа, калі гаворыць аб патрэбах народу пасол і то гаворыць ня ў вёсцы, а гаворыць у Варшаве прад урадам. Тагды яго голас чуваць ня толькі ў Польшчы, але і заграніцай і ў Сойме можна гаварыць адважна, бо за свае прамовы ў Сойме пасол адказны толькі прад Соймам. Адна бяда, што цяперашні ўрад, на чале каторага стаіць марш. Пілсудзкі, не дае гаварыць Сойму, не дазваляе склікаць яго, а нават, як гэта сам Пілсудзкі казаў марш. Дашынскаму, перашкаджае яму. Некаторыя паны хацелі-б абысьціся бяз Сойму і соймавай кантролі і за тым адгаварваюць ад выбараў, але народ павінен стойка дамагацца сваіх правоў і валам пайсьці на выбары. Калі народ, усе як адзін чалавек, пойдзе на выбары. Тагды ўрад зразумее, што народ хоча Сойму, што Сойм трэба дапусьціць да голасу, бо за Соймам стаіць народ...

Тагды і нашы паслы ў Сойме будуць магчы бараніць народ ад непасільных падаткаў, пад цяжарам каторых стогне цяпер наш народ, будуць бараніць ад чужацкага асадніцтва і калянізацыі на нашай зямлі, будуць стаяць за зямлю для нашага беззямельнага і малазямельнага народу, будуць змагацца за родную школу і асьвету — словам, стануць у абароне свайго народу. Значыць, каб пачулі наш голас, трэба выбіраць сваіх паслоў, а каб выбраць паслоў, трэба ісьці на выбары.

А каго выбіраць?

Мы будзем паддзержываць наш даўнейшы спісак № 18. Праўда, з вёскі часта прыходзілі да нас нараканьні, што паслы нічога ня робяць, што яны рэдка паказваюцца на вёску і г. д. У гэтых наракавьнях было шмат праўды, аднак было шмат і няпраўды. Трэба ведаць, што Беларусь вялікая, што аб'ехаць усе беларускія паветы за два гады трудна было і што пабываць па ўсіх мястэчках, ужо ня кажучы аб вёсках, проста такі немагчыма было.

Калі нашыя паслы і рэдка выяжджалі на вёску, то ў Варшаве заўсёды выступалі ў абароне нашага гаротнага сялянства, баранілі яго і прад асадніцтвам і новымі падаткамі — затым мы і стаім за наш даўнейшы нумар 18-ты.

Яшчэ мы болей праканаемся ў патрэбе галасаваць за восемнастку, калі мы разважым нашу ідэю, паводле якой мы пайшлі на выбары ў 1928 годзе — а гэтай ідэяй быў **блёк з іншымі нацыяналнымі меншасьцямі Польшчы**, асабліва ўкраінцамі. Мы яшчэ слабыя, нам трэба ісьці дружна з другімі народамі ў Польшчы, наш супольны голас будзе куды мацнейшы, як наш адзін — і за тым мы не павінны адказывацца ад тэй дарогі, якую мы выбралі і павінны йсьці да канца... Бо ў еднасьці сіла.

Дык на выбары за свой беларускі спісак! Не галасуйма за польскія спіскі № 2, 3, 10 і 24, бо гэтыя спіскі варожыя для нашага народу. Яны нясуць у наш край новае асадніцтва, новыя падаткі, новы зьдзек над нашым народам.

Беларусы, заявіце прад усім сьветам, так, як у 1928 годзе, што Вы сьведамая **беларуская** маса і галасуйце на нумар 18!

Вынік галасаваньня ў дапаўняючых выбарах у Сойм 25.V.1930 г. у Лідзкім вокрузе

паводле афіцыяльных падлічэньняў выбарнай камісіі.

	Лідзкім	Шчучынскім	Валожынскім	Маладэчанскім	Вялейскім	Ашмянскім	Разам
Лічба выбаршчыкаў у пав.: .	**84763**	**42039**	**51791**	**38425**	**57669**	**44478**	**319235**
Галасавала	**30188**	**16.062**	**10.592**	**10.583**	**12.035**	**18.249**	**97659**
На сьпісак:							
№ 2 (Польска Парт. Соцыяль.)	1.966	106	116	371	161	315	3.035
„ 3 (Польска Пэрт. „Вызваленьне“	137	10	156	53	506	4.416	5.278
„ 4 (Жыдоўская Партыя „Бунд“	5	1	2	2	5	8	23
„ 10 (Польскае Стронніцтво хлопскае)	16.845	11.597	4 174	51	268	6.527	39.462
„ 18 (**Блёк Нацыянальных Меншасьцяў у Польшчы**)	**1 391**	**207**	**100**	**654**	**2 525**	**677**	**5 554**
„ 20 (Сьпісак расейцаў) . .	11	3	1	14	23	2	54
„ 25 (польская эндэцыя-хадэцыя)	7.530	1793	1 695	995	1.205	4.506	17.724
„ 36 (Сьпіскі без выразнага палітычнага характару)	—	1	1	—	4	3	9
„ 37 (Сьпіскі без выразнага палітычнага характару)	—	—	1	1	—	—	2
„ 40 (Сьпіскі без выразнага палітычнага характару)	1	—	—	3	2	3	9
„ 43 (Сьпіскі без выразнага палітычнага характару)	—	5	32	85	255	16	393
„ 45 (Блёк Беларускіх сялян і работнікаў Янкі Станкевіча)	98	42	414	441	145	125	1.265
„ 46 (Беларускі Сял.-Раб. Пас. Клюб „Змаганьне“) . . .	2.204	2.297	3.850	7.913	6.936	1.651	24.851

Прыглядаючыся да гэных лічбовых даных вынікаў галасаваньня 25.V 30 у вышэй успамянутых паветах, ня можна сказаць, што беларускага народнага сьведамага элемэнту ў гэтых паветах цалком няма. Тая лічба 5554, якую атрымала 18-ка, бязсумніўна паказвае на здэцыдаваных і стойкіх сьведамых нацыянальна і палітычна беларусаў, бо сьпісак пад нумарам 18, акрамя беларускіх нацыянальных, іншых лёзунгаў, на выбарах не выяўляў, а жыды, як ведама, гэты сьпісак здрадзілі і на яго не галасавалі.

Далей, калі-б хто ўважаў лічбу 17724 галасоў польскае эндэцыі-хадэцыі (25) за галасы чыста польскія, той-бы моцна мыляўся, бо тут галасавалі тыя беларусы, каторых выкарысталі рэлігіяй.

Мыляўся-б так-жа і той, хто-бы ўважаў лічбу 24.851 галасоў „Змаганцаў“ (46) за галасы сьведамых камуністаў толькі дзеля таго, што прад самым галасаваньнем К. П. З. Б. (Камуністычная Партыя Заходняй Беларусі) выдала адозву, заклікаючы галасаваць за нумар 46 „Змаганцаў“. Хто добра знае палажэньне нашай вёскі, таму справа гэная зусім ясная. Наша вёска церпіць вялікі недастатак матэрыяльны; беззямельле і малазямельле пхае нашае сялянства ў паход за найбольш радыкальна-сацыяльнымі клічамі.

Вось-жа гэтае цяжкое палажэньне нашай вёскі дзеля сваіх інтэрэсаў выкарыстывае усходні радыкалізм „Змаганьне“ і заходні „Стронніцтва Хлопскае“. У такой матэрыяльнай бядзе, у якой знаходзіцца сяньня нашая вёска, заўсёды чалавек губляе свае вышэйшыя ідэалы і гоніцца за заспакаеньнем тых патрэб, без якіх існаваньне яго ёсьць немагчымае. Але ці гэты радыкалізм, як усходні „Змаганьня“, так і заходні „Стронніцтва Хлопскага“ вывядзе нашае сялянства з гэнае бяды матэрыяльнай? Ды не! Бо інтэрэсы „Змаганцаў“ і „Стронніцтва Хлопскага“ ані чуць не кіруюцца да патрэб нашае вёскі і яны далёка разыходзяцца з інтарэсамі беларускіх сялян. Тут тыя нашы вяскоўцы, якія сусім нясьведамыя палітычна, сусім нясьведама далі сябе на гэты час ашукаць, а „Змаганцы“ і „Стронніцтво Хлопскае“ дзеля сваіх палітычных мэтаў выкарысталі бяду і нясьведамасьць палітычную нашага сялянства.

Што датыча лічбы галасоў адданых на № 2 П. П. С., дык гэную лічбу можна ўважаць за галасы чыста польскія, бо чыгуншчыкі, якія ў большасьці належаць да гэтай партыі, амаль усе зьяўляюцца элемэнтам чыста польскім, наехаўшым з каронная Польшчы, а так-жа і работнікі малых местаў і мястэчак, якія прышлі на нашыя землі, шукаючы працы. Адносна „Вызваленьня“ трэба сказаць тое самае, што і аб галасох адданых на дзесятку „Стронніцтва Хлопскага“.

Дзеля гэтага прад намі ў лучнасьці з сьведамай часткай беларусаў нацыянальна і палітычна, стаіць вялікае заданьне паглыбляць нацыянальную сьведамасьць, пашыраючы адначасна палітычную незалежніцкую ідэолёгію. Пры гэтым-жа трэба незабывацца аб працы культурнай і эканамічнай сярод нашага сялянства. Гэта наш шлях і мы мусім па ім ісьці.

Нямецкі міністр Курціюс аб уціску народных меншасьцяў.

У адным месьце Нямеччыны адбылася акадэмія, якую ладзіў нямецкі заграпічны інстытут, на якой мін. Курціюс сказаў прамову, пасьвячаючы яе пытаньню народных меншасьцяў.

М. Пяцюкевіч.

Беларускія народныя песьні

з вёскі Цяцерак, пав. Браслаўскага.

(Запісаў М. Пяцюкевіч у Ганны і Юлькі Пяцюкевічыхаў і Ядвісі Гашчэнкавай.

УВАГА. Гэтыя песьні запісаныя так, як дыктавалі ўспомненыя асобы, ці інакш кажучы — запісаныя ў мове Браслаўшчыны.

ВЯЛІКАДНЫЯ
(на калысцы).

Што ў полі.

Што ў полі за лялеіцца?
Ці ня бель пабіляецца?
Ці макаўка расьцьвітаецца?
Ня бель пабіляецца,
Ні макаўка расьцьвітаецца,
Дачка ў матулькі красуіцца,
Па зялёным садзе ходзючы,
Вінаградачак шчыпаючы,
Белы ручанькі ламаючы.

У нядзельку.

У нядзельку раніңька
Марысінька дары кроіла;
Ні папала ў палаценка,
Ды папала ў шчыра сэрдэнька.
Мой татулька, мой родніңькі
Не хавай мяне ў магільнічку,
А хавай мяне пры гасьцінчыку,
Там паедзіць каралевы сын,
Дый будзіць ён пытацісі:
Чыя тут то магілачка?
Ці не маей то дзяўчыначкі?
Калі маей то дзяўчыначкі —
Конікі, каб гарой сталі,
А я сам маладзец—зялён явор.

Жачак.
(Малыя дзеці, ходзячы па хатам, укленчыўшы мовяць).

Я малы жачак,
Ні карунбачык,
Ня многа ўмею,
Ня столькі разумею.
У школе не бываў я,
Розак не відаў я;
Розгі зялёны
З дрэва ламлёны.
Малыя дзеткі
Шчыпалі кветкі,
Пры дродзы сталі
Язуса віталі.
Езус маленькі
З чыстай паненкі,
Ён з гробу ўстае,
Нам радасьць дае.
А з тэй радосьці
Віншую яхмосьці.
Яйка маляванэго,
Сыра бялэго
Прoша даць,
Не шкадаваць,
Каб было зашто падзінкаваць.
Я малы тылец
З падпечку вылез,
У дудачку йграю,
Хрыста забаўляю.
Селі дзеткі есьць,
А мне недзя сесьць.
Я за пірог
І за парог,
Дзеўкі дагналі,
У каўнер надалі.
Я малы дзяцінак,
На рэпе націнак,
З кішанькам хаджу,
Валачобнага прашу.
Проша даць,
Не шкадаваць,
Каб было зашто падзінкаваць.
Я рукі паднашу
І валачобнага прашу—
Яйко і грошы.
(Гэта песьня не пяецца, але рэцытуецца).

Гаспадарскі „Хрыстос“. № 1

Ідзём, пайдзём ўдоль вуліцы.
Сьпівайце братцы — сьпівайце!

*) Сьпівайпе братцы — паўтараецца за кожным радком.

Ўдоль вуліцы, ўдоль шырокай,
Удоль далёкай ў хазяйскі двор.
Хазяюшка — наш бацюшка.
У тваім дварку, як у вянку.
Хазяюшка—наш бацюшка.
Ці ёсьць дома, ці ў дарозі?
Ці сьпіш, ляжыш — адпачываеш?
Ці з жаною-маладою?
Ці з дзеткамі маленькамі?
Калі-ж, ты сьпіш — устань рана;
Устань рана, мыйся бела,
Мыйся бела, як папера,
Ды падайдзі пад ваконца.
Тваё ваконца на ўсход сонца.
Проці вакна зялёны сад.
У тваім садзі— вінаградзі
Новы касьцёл будуіцца.
А ў касьцелі на прыстолі
Сам Бог сядзіць з анёламі.
Каля Бога ўсе Сьвятыя
Шыхуюцца, рахуюцца,
Катораму ў перад стаць?
Усім сьвятцом з новым лятцом.
Сьвяты Ізбор—вадзічку з гор.
Зьвіставаньня зімцы шкодзіць;
Зімцы шкодзіць—сошку ладзіць;
Сошку ладзіць — каня гладзіць.
Чысты чацьвер заворваіць
Новай сахой, гнядым канём.

Мін. Курціюс між іншым заявіў, што ў Эўропе жыве 35 мільёнаў людзей, якіх залічаюць да народных меншасьцяў, а дзеля гэтага выплывае неабходнасьць спэцыяльнай міжнароднай абароны гэтых народных меншасьцяў.

Мін. Курціюс заявіў: трактаты абароны народных меншасьцяў, на жаль, ня ёсьць выкананы. Меншасьці змушаны змагацца прадусім проціў неправільнага тлумачэньня разуменьня дзяржаўнай сувэрэннасьці, з якой выплывае уціск і несправядлівыя адносіны пануючых народаў адносна народных меншасьцяў, прадусім адносна тых меншасьцяў, якія на сваей тэрыторыі зьяўляюцца народнай большасьцяй.

З гэтых слоў нямецкага міністра вычуваецца тое незадаволеньне з палітыкі паваеннай Эўропы, якое народныя меншасьці ужо перажываюць і з чым змагаюцца больш 10 гадоў.

З газэт.

Панскі „Nasz Przyjaciel" дамагаецца закрыцьця „Беларускае Крыніцы.

У нумары 28 сёл. г. панскай газэціны „Nasz Przyjaciel" польскі ксёндз Тадэуш Макарэвіч рэдактар гэнай часопісі зьмясьціў карэспандэнцыю нейкага пана Міхала Рутkоўскага з Браслаўскага пав., у якой пан Руткоўскі плача, што ў Ёдзкай гміне Браслаўскага пав. не прышчапляецца польшчына. Паводле разжаленых слоў пана Руткоўскага пашырэньню польшчыны сярод беларусаў Ёдзкай гміны стаіць на перашкодзе „Беларуская Крыніца", якая вельмі пашыраецца ў тых ваколіцах.

Пан Руткоўскі, трымаючыся нехрысьціянскай засады — „паваліў і адабраў" — кажа проста: „Гэткая газэта („Беларуская Крыніца") непавінна нават існаваць у граніцах Польшчы".

Што так думае змагацца з беларусамі і гэтага дамагаецца нейкі пан Руткоўскі, дык гэта нас ня дзівіць, бо мы польскіх паноў на беларускіх землях добра знаем, але што з гэткім спосабам змаганьня ды згаджаецца каталіцкі ксёндз, рэдактар „Нашага Пшыяцеля" Тадэуш Макарэвіч, дык сапраўды дзіўна. Мусіць дзеля гэтага гэты ксёндз і выракаецца свайго ксяндзоўства, падпісваючы „Nasz Przyjaciel" „Тадэуш Макарэвіч", бяз „ксёндз".

З беларускага жыцьця.

Дэлегацыя ў арцыбіскупа Ялбжыкоўскага. 27 чэрвеня с. г. Беларуска-Літоўскі Каталіцкі Камітэт быў выслаўшы дэлегацыю да арцыб. Ялбжыкоўскага ў асобах д-ра Б. Грабінскага і дыр. Я. Кайрукштіса, каб супольна праводзіць у жыцьцё пастановы каталіцкага зьезду Беларусаў і Літоўцаў з 4.V. сёл. г.

Арцыбіскуп супрацоўнічаць з успомненым камітэтам адмовіўся.

Ясная справа, што такіх вынікаў з гутаркі дэлегацыі с арцыбіскупа трэба было спадзявацца, бо дзе ж польскі біскуп можа згадзіцца на супрацоўніцтва з Беларусамі і Літоўцамі і задаволіць іх патрэбы, калі ён наагул ня прызнае самога існаваньня беларускага народу.

Аб выніках матуральных экзаменаў у Віл. Бел. Гімназіі. Як уперад мы пісалі, да пісьменных экзамінаў у Віл. Бел. Гімн. прыступіла 27 асобаў: 15 вуч. Віл. Бел. Гімн. 5 вучняў Клецкай Бел. Гімн. і 7 экстэрнаў. Да вусных дапушчана 14 вуч. Віл. Бел. Гім. 1 Клецкай Бел. Гім. і 4 экстэрнаў. На вусных экзамінах „зрэзаліся": 1 вуч. і 1 экст. Матуру атрымалі ў гэтым годзе наступныя асобы: Л. Галяк, З. Гур'янава, М. Кунцэвіч, С. Мацук, М. Маркевіч, Н. Патомская Р. Рак.-Міхайлоўскі, Ул. Рудніцкі, А. Сакалоў, В. Тумаш, М. Вітушка, Э. Залкінд, П. Засім, У. Казак, Хв. Ільляшэвіч, А. Мюлер і С. Яцкевіч.

Усім матурыстым жадаем энэргічна і вытрывала працаваць у вышэйшай школе дзеля дабра нашае Бацькаўшчыны Беларусі!

З літоўскага жыцьця.

З НЕЗАЛЕЖНАЕ ЛІТВЫ.

Унівэрсытэт ім. Вял. Кн. Вітаўта. Літоўскі Унівэрсытэт апрацаваў для сябе новы статут, які ўжо зацьвярджаны Радай Міністраў і Прэзыдэнтам. Паводле гэтага статуту літоўскі унівэрсытэт будзе называцца Унівэрсытэтам Вял. Кн. Літоўскага Вітаўта.

Рэдкі слоўнік. У Фінляндыі, у бібліотэцы Гельсінгфорскай знашлі цікавы слоўнік лацінска-літоўска-польскі, які напісаў езуіт Шырвід. Слоўнік гэны называецца „dictionarium trium linguarum" (Слоўнік трох моваў), выданы ён у Вільні ў 1640 годзе. Дагэтуль было толькі ведама, што гэткі слоўнік у сваім часе быў выданы, але ня быў ведамы ані адзін яго экзэмпляр. Вось-жа адкрыцьцё гэнага слоўніка мае вялікае значэньне для навукі літоўскае мовы.

Прыезд 500 амэрыканскіх літоўцаў. Нямецкія газэты падаюць да ведама, што пад канец траўня с. г. з Нью-Ёрку на швэдзкім параходзе „Оскар II" выехала ў Літву ў адведзіны 500 асоб амэрыканскіх літоўцаў.

З ЛІТВЫ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Прыезд з Рыгі моладзі літоўскай гімназіі. У канцы траўня сёл. г. Вільню адведала моладзь літоўскай рыскай гімназіі на чале з дырэктарам кс. Ёдовалькісам. Апрача Вільні экскурсанты адведалі так-жа Трокі і агулам ваколіцы Вільні. Віленскае літоўскае грамадзянства сваіх гасьцей з Латвіі прымала дужа сардэчна і ўрачыста.

Канфіската газэты „Vilniaus Rytojus". Нумар літоўскай часопісі „Viln. Rytojus", у якім было апісана пагранічнае непаразуменьне між літоўцамі і палякамі ў Дмітроўцы, сканфіскаваны.

З Польшчы.

Сэнатары дамагаюцца склiканьня Сэнату. Дня 4 г. м. 38 сэнатараў падалі прэзыдэнту пісьмо, у якім дамагаюцца скліканьня Сэнату. Ці будзе склікана надзвычайная сэсія Сэнату, няма ведама.

Што будзе з Соймам? Апазыцыйныя да ўраду польскія газэты пішуць, што паводле чутак, якія ходзяць у соймавых кругох, Сойм ужо больш не зьбярэцца. Пытаньне толькі, калі яго разьвяжуць.

Паводле праводу і сэнатарскай заявы аб скліканьні надзвычайнай сэсіі Сэнату, Сэнат павінен быць скліканы 18 г. м. Адны гавораць, што ў гэты дзень будзе развязаны Сойм і Сэнат, пасьля чаго адбудуцца выбары яшчэ сёлета ў месяцы верасьні. Другія талкуюць, што выбары будуць расьпісаны толькі вясной.

Але і ўрад ня ведае, што рабіць. Сярод розных чутак ходзяць і такія, што ўрад і сам ня ведае што рабіць з Соймам і Сэнатам. Эндэцкія газэты падаюць, што ўрад выслаў да старастаў „квэст'ёнар", у якім пастаўлены два пытаньні: 1) Як людзі адносіліся-б да разьвязаньня Сойму? і 2) Як паставіліся-б да нерасьпісаньня новых выбараў?

Вялікая суботанька —
Канчаецца работанька.
У гэты дзень красюць яйкі.
А Вялікдзень разгаўляцца
З сырам, з маслам, з яйком красным.
Праводная—сьвет праводзіць.
Сьвяты Ягор у поля едзь,
У поля едзь еравоя.
Адамкні зямлю, пусьці расу,
Пусьці расу, на ўсю вясну.
А расіца — мядавіца,
А травіца шалкавіца.
Сьвяты Мікола па межах ходзіць,
Па межах ходзіць, калены ставіць;
А гдзе суха, там падмочыць,
А гдзе мокра, там падсушыць.
Сьвятая Тройца колас точыць,
Колас точыць, раі роіць.
Сьвяты Іван, стары касец,
Касу точыць — касіць хочыць:
Сьвяты Пятро, у жыці—ядро.
А Дзісятка ў жыці-пятка.
Сьвятая Ільля,—старая жнія:
Што раз разьнець, то сноп кладзець,
А сьвяты Спас жыта возіць,
Жыта возіць, скірды ложыць,
Высокія, шырокія.
Прачыстая жыта сеіць,
А другая ей у помач.
Сьвяты Пакроў з усім дамоў.
Усе Сьвятыя укрый Божа:
Пчалу мёдам, ваду лёдам.
Хазяюшка, наш бацюшка,
Ці ў слух табе наша песьня?
Калі у слух, масьці кладку,
Масьці кладку, заві ў хатку;
Заві ў хатку дары гасьцей.
А мы госьці нічастыя,
Ні частыя, няпростыя, —
Ня простыя — з Масквы купцы.
Ні часта ходзім, ня многа просім:
Адзін разок ў адзін гадок,
У вадзін гадок на Вялікдзень.
Ні часта ходзім ня многа просім:
Маім братцом па трыцатак,
Мне самому хоць дзісятак,
А музыцы бізязыцы
Хоць памазаць па языцы.
Калі ласка — водкі фляшка,
Калі сіла — хоць паўсыра,
Калі змага — паўпірага.
Хрыстос Уваскрос!

„Хрыстос" № II..
(Сьпяваецца для дзяўчат).
Ідзём, пайдзём ўдоль вуліцы
Сьпівайце братцы, сьпівайце!
Удоль вуліцы ў паненскі двор,
Паненскі двор на сем вакон:
Гэты вокны няпростыя,
Няпростыя — кляшторныя,
Кляшторныя — каштоўныя.
Паненачка — сьлічна панна,
Сьлічна панна каралеўна.
Добры вечар, паненачка!
Ці сьпіш, ляжыш—адпачываеш?
Калі-ж ты сьпіш — устань з ложку,
Устань з ложку, абуй ножку
У чаравічкі шаўковыя,
У панчошкі бялёвыя,
Падвязачкі шалковыя.
Надзень сукню едвабную,
Надзень футру ксамітную.
Прычашыся гладзюсінька,
Да падыйдзі, блізюсінька,
Да падайдзі ністыдзіся.
Вазьмі крэсла да садзіся;
Сядзь пад аконца, на ўсход сонца.
Проці акна зялёны сад,
А ў тым садзі — вінаградзі —
Кветкі цьвіцяць, расьцьвітаюць,
Птушкі пяюць, расьпеіваюць,—
Салавейкі—канарэйкі.
Паненачка, сьлічна панна,
Сьлічна панна каралеўна.
Ішла па саду зялёнаму;
Сваё кветкі палівала,
Розных кветак назьбірала
І вяночак завівала,
На галоўку надзівала;
На галоўку, на буйнаю
на косачку на русаю.
Паненачка, сьлічна панна,
Сьлічна панна каралеўна,
Ішла ля мора біражочкам,
А на моры бель бяліла,
Златы персьцінь ураніла.
Ішла ля мора біражочкам,
Да тужучы, бядуючы;
Белы ручкі ламаючы,
Златы персьцінь шукаючы.
Напаткала трох малайцоў:
—Ах малойцы — рыбалоўцы,
Вы закіньці шалковы невад,
Да ўлавіці златы сыгнат."
А малойцы-рыбалоўцы
Закінулі шалковы невад,
Да ўлавілі златы сыгнат.
„—Я малада вам прыгаджуся:
Аднаму дам заловачку,
А другому сьвякровачку,
А трэціму сама млада;
Сама млада, як ягада."
Паненачка, сьлічна панна,
Сьлічна панна каралеўна.
Ці ў слух табе, наша песьня?
Калі ў слух, масьці кладку,
Масьці кладку, заві ў хатку... і г. д.
(як у першай песьні).

(д. б.)

З заграніцы.

Кампрамітацыя бальшавікоў заграніцай. У Парыжы. Пасьля ведамай ужо дэзэрцыі з дзяржаўнага савецкага становішча заграніцай Бесядоўскага, надовячы ўцёк так-жа ад бальшавікоў цэнтральны сэкрэтар савецкага банку для паўночнай Эўропы, Крукоў.

Крукоў, пакідаючы сваё становішча, заявіў, што аканчальна зрывае з камуністымі. Адначасна Крукоў апублікаваў у газэтах, што ён разачараваўся ў камунізме, бо камуністычны лад замест дабрабыту для працоўных масаў, прыносіць голад і ўціск.

Крукоў належаў да кам. партыі ад 1917 году і займаў у бальшавікоў высокія становішчы.

Выступленьне Крукава ў савецкай амбасадзе зрабіла вялікі перапалох, бо Крукаў знае многа бальшавіцкіх тайніцаў.

Пасьля Крукава Наумаў. Дня 7 г. м. праяжджаючы праз Польшчу з Парыжа ў Маскву Савецкі гандлёвы прадстаўнік у Парыжы Наумаў пастанавіў уцячы ад бальшавікоў і высеўшы з вагону на ст. Белая Падляская, будучы знэрваваны, пакалечыў сябе нажом.

Наумаў цяпер знаходзіцца ў шпіталі ў Польшчы, дзе заявіў, што ў Маскву не паедзе і з бальшавікамі зрывае на заўсёды. Дзеля гэтага зьвярнуўся з просьбай да польскіх уладаў аб дазвол прабываць у Польшчы паўтара месяца, каб паздаравець, а пасьля мае выехаць у Францыю.

Мусіць ня сусім добра ў Саветах і для камуністаў, калі яны туды з заграніцы ні зашто ня хочуць ехаць.

Вызваленчы рух у Індыі штораз то ўсё ўзмацняецца. Не паможа для Англіі і палестынская палітыка, дзе англійцы адвярнуўшыся ад жыдоў, пахіліліся ў бок арабаў дзеля здабыцьця для Англіі добрай апініі сярод мусульманскага сьвету.

Мусіць добра ўжо разумеюць індыйскія магамэтане ангельскія палітычныя манэўры, бо не зважаючы на такі рэзкі паварот англійцаў у Палестыне ў бок магамэтан Арабаў, усё-ж-такі індыйскія магамэтане пашлі супроць англійцаў, салідарызуючыся з індыйскімі нацыяналістамі.

У Бомбаю адбыліся вялікія маніфэстацыі магамэтан, якія прылучыліся да індыйскага вызваленча-незалежніцкага руху. Вуліцамі места прайшоў вялізарны паход даўжынёю на паўтара кілямэтра. Магамэтане выдалі адозву, у якой заяўляюць, што яны прылучаюцца да індыйскага кангрэсу і адначасна заклікаюць байкатаваць ангельскі ўрад і ангелійскія тавары.

Гэнае становішча магамэтанскага насельніцтва Індыі выклікала ў урадавых кругох Англіі вялікае занепакаеньне, бо ангелійскі ўрад надзеіўся на нязгоду між Індыйцамі і магамэтанамі, вызнаўцамі двух рэлігіяў.

Да нас пішуць.

КУЛЬТУРНАЯ ПРАЦА.

в. Алешкі, Вялейскага пав. Будслаўскі Гурток Б. І. Г. і К. зладзіў у нядзелю 1 чэрвеня 1930 г. спэктакль-вечарыну ў в. Алешкі, Будслаўскае гміны. Ставілі п'есу „Выбары Старшыні“ Я. Быліны. Спэктакль прайшоў вельмі ўдала, сьцягваючы каля 300 асоб публікі. Пасьля спэктаклю наладжаны былі ў дзьвюх хатах скокі і моладзь гуляла да ўсходу сонца. Апрача арганізатараў належыць падкрэсьліць вялікае зацікаўленьне і здольнасьць да працы Алешкаўскіх хлопцаў і дзяўчат. Яны ўласнымі сіламі збудавалі на таку вельмі ўдалую сцэну, а таксама вельмі хараша прыбралі ўвесь ток, дзе адбываўся спэктакль, бярозкамі. Дарожку ў гумно таксама абсадзілі бярозкамі, так што любата была глядзець. Чэсьць Табе беларуская моладзь! Гледач.

ДУРАЦЬ ГАЛОВЫ СЯЛЯНАМ.

Сьвянцянскі пав. Ні з сяго ні з таго у нас узноў пачаліся выбары ў Сойм, ці лепш сказаць агітацыя. Яшчэ нашы людцы не забыліся тых абяцанак рожных польскіх партыяў з 1928 году, а ўжо як град пасыпаліся абяцанкі новыя. І чаго-ж гэтыя агітатары польскіх партыяў не абяцаюць? Усе яны гавораць так салодка, так добра і ўсе хочуць дабра для нашага гаротнага селяніна. Як паслухаеш іхніх байкаў, дык усе яны адзін ад другога лепшыя — хоць вазьмі ты чалавек і за ўсіх разам галасуй. Дзіўна толькі тое, што чаму гэта яны—гэтыя польскія партыі, калі яны такія ўжо добрыя для беларускага селяніна, сьпярша чымсь ісьці на выбары і прасіць у беларусаў галасоў за свае нумары, гэтай дабраты, якую так моцна абяцаюць, ды не зрабілі прад выбарамі? А то ўсё толькі абяцаюць. А як прыдзецца да дзела ў Сойме, дык і няма іх. Тады толькі тыя беларускія паслы выступаюць у абароне нашых беларускіх сялянскіх інтэрэсаў, якімі цяпер на выбарах страшаць беларускіх выбаршчыкаў найміты польскіх партыяў. Цяпер гэныя найміты страшаць нашых людзей, што беларуская восемнастка лучыцца з украінскай, нямецкай, а нават і жыдоўскай буржуазіяй, а з імі і гаворыць ня хоча, а яны-ж такія дабрадзеі для нашага сярмяжніка. Але як прыдзецца аб гэтай справе гаварыць у Сойме, дык гэтыя польскія „дабрадзеі“ дамагаюцца, каб прысылаць яшчэ больш на нашыя землі польскіх асаднікаў, аб зямлі для нашага селяніна і чуць ня хочуць. Тады толькі паслы з 18-кі, як беларускія так і украінскія выступаюць процiў асадніцтва і дамагаюцца, каб была надзеляна зямля на Беларусі для беларусаў.

Дык вось якія гэта „прыяцелі“, што цяпер абяцаюць усё.

Браты беларусы, нам трэба ведаць, што ўсе польскія партыі, пачынаючы ад самай правай да апошняй левай ёсьць для нас аднолькавымі „прыяцелямі.“ Нам заўсёды трэба галасаваць толькі за свае партыі беларускія. Ведама тое, што дабра нам ніхто не прынясе, а толькі самы сабе мусім каваць лепшую долю. Пры гэтым мусім высьцерагацца ваўкоў у авечай скуры г. зн. ня ісьці за тымі кірункамі, якія падшываюцца пад беларускасьць. Гэтак робяць і камуністы і палёнофілы. Яны адзяюць на сябе беларускую аўчынку, каб наш беларускі селянін ня так скора іх пазнаў, хто яны такія. Дык пры галасаваньні будзьма асьцярожны і аддаваймa галасы за свой беларускі сьпісак 18.

Беларус—народнік.

Аб гаспадарцы.

Сенакос.

Пакуль прыйдзе пара сенакосаў, трэба гатовым быць з усімі астатнімі працамі ў полі. З другога боку ўзноў нельга з касьбой і пазьніцца: чым хутчэй тым лепш. Калі ходзіць аб тое, калі трэба сенажаць касіць, дык адказ просты: тады, калі большасьць прынамся траў на гэтай сенажаці **пачынае** цьвісьці. Падчырківаю „пачынае“, бо калі перацьвіце, тады ўжо позна. Тады ўсе спажыўныя сокі з сьцябла травы пяройдуць у зерне, якое выпадзе, а астанецца самая толькі салома, спажыўчая вартасьць каторай, ёсьць вельмі і вельмі нязначнай, ведама—салома. Апрача таго, чым пазьней сенажаць косіцца, тым горш пасьля адрастае.

Пры сушэньні сена вельмі добрую ўслугу даюць сумысьля робленыя трыногі, на каторыя кладзецца зьвялае сена і трымаецца там, аж пакуль ня высахне. Ужываньне такіх трыногаў бывае тым больш патрэбным, чым больш у сене траваў матыльковых (канюшынных). Для сушэньня-ж самой канюшыны гэткія трыногі папросту незамянімыя, бо даюць магчымасьць высушыць канюшыну не абіваючы і не абрываючы з яе найдрабнейшых лісточкаў, якія бываюць да таго і найбагацейшымі на спажыўчая сучасткі (бялкі). Таму, хто сее канюшыну, той мусіць парупіцца, каб мець такія трыногі.

Складаць сена ў адрыню, ці гумно можна толькі сусём сухое. У праціўным выпадку яно разаграв ецца, а здарылася і так, што сена гэтак разагрэўшыся навет запалялася полымем. Што гэта ў гаспадарцы знача, ня трэба хіба казаць. Таму зложанае сена ў гумне трэба час ад часу прабаваць. Калі-б яно загравалася, треба неадкладна выкінуць надвор і перасушыць. У разе трывалай непагоды хапае часам перакласьці пласты сена ценкімі пластамі роўнай саломы, або навет сухім хворастам. Гэтымі пластамі саломы, ці хворасту дастаецца ў сена паветра і прасушывае.

У добра ведзеных гаспадарках сенажаці па прыбраньні сена не ляжаць бяздзейна. Робіцца гэтак: сенажаць барануецца вострай зялезнай бараной, засяваецца і прывалковываецца цяжкім гладкім валкам. Зразумелая рэч, што ўпраўляць можна толькі сенажаці вольныя ад моху, які трэба прад тым выбаранаваць.

Больш пашы!

Варункам выплачальнасьці землеробства ў нас ёсьць падняцьце гадоўлі хатняй жывёлы. Гэта аднак патрабуе добрай пашы, на якую у нас бывае вялікі голад. У большасьці выпадкаў натуральныя сенажаці ня хопяць. Трэба што-раз больш сеіць кармовыя травы і наагул расьціны, якія-б успамагалі нястачу добрых і адпаведна вялікіх сенажацяў. Пятае праз дзесятае ў гэтым кірунку ўжо робіцца. Трэба аднак рабіць значна больш, трэба пашырыць засевы траваў канюшынных (у перамешку з травамі мурожна-салодкімі) і каранёпладоў (кормныя буракі).

На асаблівую ўвагу аднак заслугоўвае мяшанка г. зв. сьвятаянскага жыта з касматай выкай. Гэтыя засевы (у м-цы ліпні) даюць ужо ў **познай** восені шмат і вельмі добрай пашы а таксама і ў **ранную** вясну, калі на ўсё іншае яшчэ бывае за рана. На hа*) сеіцца каля 220 клг. (7 – 8 пудоў) жыта і 60—100 клг. (4—6 пудоў) выкі.

Трэба згары зазначыць, што шырэйшаму землеробству нашага краю (Віленшчына, Наваградчына) няведама, як гэта мяшанка ў нас удаецца. Дагэтуль ня чувацца было, каб хто яе сеіў. Таму сьлепа раіць сеіць гэту мяшанку нельга. Хай хто небудзь спрабуе пасеіць гэту мяшанку на малым загончыку і аб выніках напіша ў газэты, бо „варта скурка вырабкі“. *(З працаў інж. А. К.)*

*) hа-гэктар, крыху меншы ад дзесяціны.

Наша пошта.

Вяснавому Беларусу. З прысланага карыстаем, пішыце больш.

І. Пупіну. З корэспондэнцыі скарыстаем.

Вясковаму. З Вашых вестак скарыстаем, пішыце больш і цікавей, каб вестка мела агульнае значэньне, а не лёкальнае.

Ігн. Лобачу ў Амэрыцы. Высылаем Вам друкі Б. Х. Д. дзеля бліжэйшага азнаямленьня з гэтай партыяй.

І. А. Космавічу. З прысланага скарыстаем, пішыце больш з Вашай старонкі.

С. Дубейко. Дужа цешымся з Вашых пачынаньняў. Толька адно ведайце і перакнайце аб гэтым сваіх дзяцей, што ніхто нам ня створыцця шчасьця і лепшую долю, калі мы самі нічога ня будзем рабіць. Мы самі мусім стацца кавалямі сваей лепшай долі.

Грошы атрымалі ад: Аўсюкевіча 2 зл, К. Вэнцкевіча 2 зл., С. Дубейкі 1 зл. 50 гр., Я. Максімчыка 1 зл., М. Чарнэцкага 2 зл., Прат. Б. Бабкоўскага 4 зл. і Я. Беляка 3 зл.

Сьвята Вясны!
У Нядзелю 15 г. м.
у Салі Гандлёва-Прамысловага Клюбу
(вул. А. Міцкевіча 33а)
ЛІТОЎСКАЯ МОЛАДЗЬ
ладзіць:
КАНЦЭРТ
ПРАГРАМА:
Сьпеў солё і хорам, духавая сымфонічная аркестра і скокі.
Пачатак а гадз. 19 мін. 30.
Білеты пры ўваходзе.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч